# Угодкі Максіма Багдановіча

Што такое музей? У першую чаргу гэта экспанаты, якія складаюць аснову экспазіцыі. Збіраннем экспанатаў, іх рэстаўрацыяй і навуковай апрацоўкай займаліся супрацоўнікі. Нельга сказаць, што мы пачыналі на пустым месцы. Напрыклад, галоўны бібліёграф Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна Ніна Ватацы шмат гадоў па асабістай ініцыятыве і за свой кошт збірала матэрыялы пра Максіма Багдановіча. Гэтыя экспанаты яна перадала ў фонды нашага музея і яны паслужылі добрым падмуркам для пабудовы экспазіцыі. Мы ж ездзілі па камандзіроўках у мясціны, дзе жыла сям'я Багдановіча: Н. Ноўгарад, Яраслаўль, Вільня, Ялта, каб па крупінках збіраць тое нямногае, што засталося на ўспамін аб Максіме. Хадзілі таксама па старых раёнах Мінска, лазілі на гарышчы, каб сабраць рэчы — аналагі тых часоў.

Але экспанат сам па сабе не быў бы такім цікавым, калі б не мастакі, якія робяць для іх дастойную аправу. Паколькі будынак, дзе нарадзіўся Максім Багдановіч, не захаваўся, пад музей быў выдзелены звычайны дом, пабудаваны ў канцы XIX ст. Ён знаходзіцца ў Траецкім прадмесці і ў сваім першапачатковым выглядзе ніякіх паэтычных пачуццяў не выклікаў. І, магчыма, толькі талент і адчуванне ўнутранага свету паэта дапамаглі мастаку Эдуарду Агуновічу распрацаваць, а групе выканаўцаў стварыць экспазіцыю, дастойную такога паэта, як Максім Багдановіч. Музей прыняў сваіх першых наведвальнікаў 9 снежня 1991 года, да 100-годдзя паэта.

Пабудова яго экспазіцыі нетрадыцыйная, у яе аснову пакладзена адзінае прыжыццёвае выданне Максіма Багдановіча — паэтычны зборнік «Вянок». Праходзячы па залах музея, мы даведваемся не толькі аб жыцці і творчасці паэта, публіцыста, крытыка, перакладчыка, але адчуваем яго мастацкі свет, дзе пануюць гармонія і хараство. Кожная з пяці залаў адпавядае аднаму з цыклаў вершаў зборніка: «У зачараваным царстве», «Згукі бацькаўшчыны», «Старая Беларусь», «Вянок», «Мадонны». Аздабленне залаў стылізавана пад «мадэрн». За мастацкую распрацоўку і афармленне нашага музея Э. Агуновіч атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі.

Той, хто знайшоў час прыйсці да нас, не шкадуе аб гэтым. Людзі не могуць жыць толькі будзённымі праблемамі. У сваім творы «Апокрыф» вуснамі Хрыста М. Багдановіч прамаўляе «...добра быць коласам, але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?»

Але музей — гэта не толькі экспазіцыя. У яго фондах сабрана больш за 14 тысяч экспанатаў. Супрацоўнікі займаюцца вывучэннем і публікацыяй навуковых матэрыялаў. Рыхтуем да друку зборнікі дакументаў і лістоў сям'і Багдановічаў і іх акружэння. Праводзяцца навуковыя канферэнцыі, вечарыны і выстаўкі.

25 мая, у дзень смерці Максіма Багдановіча, традыцыйна аматары яго творчасці ўсклалі кветкі да помніка ў Мінску, а ў музеі адбылася вечарына, прысвечаная памяці паэта.

**Валянціна БЯЛЯЎСКАЯ.**